***Наталля Зюлько***

**ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ МОЛАДЗІ СРОДКАМІ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ**

*Выхаванне сваім краем, роднай зямлёю, дарагімі краявідамі,*
*традыцыямі і добрымі справамі продкаў –*
*ці не гэта з'яўляецца самым важным ва ўсёй сістэме і выхавання ?*
Янка Сіпакоў

Спадчына надаецца чалавеку аднойчы і назаўсёды разам з жыццём. Нашы продкі збераглі яе і перадалі нам у надзеі, што мы перададзім яе сваім дзецям, унукам, праўнукам. Вельмі хочацца, каб гэта спадчына стала даражэйшай за ўсё на свеце і для нашай моладзі, каб яна змагла яе таксама перадаваць сваім нашчадкам. Сёння перад народам Беларусі стаіць вельмі актуальная задача – кансалідацыі грамадства, якая можа быць вырашана пры ўмове ўдзелу моладзі ў гэтым працэсе, таму што менавіта моладзь валодае высокім патэнцыялам энергіі, дынамізму.

Моладзь можна разглядаць як асобную сацыяльную групу, якая мае свае, уласцівыя толькі ёй асаблівасці і прыкметы, якія шмат у чым абумоўлены пэўнымі аб'ектыўнымі і суб'ектыўнымі фактарамі. Так, розныя формы грамадскага, эканамічнага, палітычнага жыцця ўплываюць на запатрабаванні, інтарэсы, вызначаюць каштоўнасныя арыенціры маладых людзей, што ў канчатковым выніку фармуе сацыяльны партрэт моладзі. Ва ўзроставай псіхалогіі маладосць характарызуецца як перыяд фармавання ўстойлівай сістэмы каштоўнасцяў, станаўленні самасвядомасці і фармаванні сацыяльнага статуту асобы. Моладзь, выхаваная ў духу патрыятызму, з'яўляецца гарантам годнай будучыні любой дзяржавы.

Паводле азначэння, якое даецца ў філасофскім слоўніку, патрыятызм (ад грэцкага слова «patris»– «айчына») – гэта «маральны і палітычны прынцып, сацыяльнае пачуццё, зместам якога з'яўляецца любоў да айчыны, адданасць ёй, гонар за яе мінулае і сучаснасць, імкненне абараняць інтарэсы радзімы».

Прынята разглядаць патрыятызм у двух аспектах: любоў да тых мясцін, дзе нарадзіўся, адкуль паходзіць твой род і адданасць і вернасць дзяржаве, у якой жывеш і якой служыш. Пачаткам такога падзялення, на маю думку, можна лічыць узнікненне першых формаў дзяржаўнасці. На пэўным гістарычным этапе гэтыя два паняцці з'яўляюцца тоеснымі (у часы існавання гарадоў-дзяржаў, асобных княстваў). Аднак, з узнікненнем больш буйных дзяржаўных утварэнняў, паняцці гэтыя разыходзяцца ў сваім аб'ёме і лексічным значэнні (напісанне слова «радзіма» з вялікай і з малой літары ў залежнасці ад сэнсу). Неабходна адзначыць і тое, што ў розныя перыяды гісторыі важнасць, перавага аднаго над другім вызначаецца па-рознаму [4, с. 2-8].

З развіццём грамадства фарміруюцца больш складаныя па сваёй структуры тыпы сацыяльных адносін. Чалавек аказваецца адначасова ўключаным у рознахарактарныя, разнапланавыя і, часта, рознанакіраваныя працэсы, якія закранаюць усе сферы функцыянавання чалавечай супольнасці: палітыку, эканоміку, рэлігію, навуку, мастацтва. У залежнасці ад патрэб развіцця змяняюцца прыярытэты, каштоўнасныя арыентацыі як у грамадстве ў цэлым, так і ў свядомасці кожнай канкрэтнай асобы ў прыватнасці. Адбываюцца, сярод іншага, змены ў інтэрпрэтацыі некаторых з'яў культуры, карэкціроўка зместу фундаментальных паняццяў, якія маюць вырашальнае значэнне для паспяховага функцыянавання і развіцця соцыўму.

Патрыятычнае выхаванне, фарміраванне культуры міжнацыянальных адносін выступаюць сёння як прыярытэтныя напрамкі дзяржаўнай культурнай і адукацыйнай палітыкі. Патрыятызм – гэта гістарычна складзеная і развіваючаяся катэгорыя сацыяльнай педагогікі, якая адлюстроўвае ўстойлівыя станоўчыя адносіны людзей да сваёй Айчыны.

Патрыятызм з'яўляецца важным фактарам кансалідацыі грамадства. Ён выступае ў якасці важнага ўнутранага мабілізуючага рэсурса развіцця грамадства, актыўнай грамадзянскай пазіцыі асобы, гатоўнасці яе к самаадданаму служэнню сваёй Айчыне. Само паняцце патрыятызм звязана з мноствам ідэй: нацыянальнай, гістарычнай, культурнай, геаграфічнай і г.д. [4, с. 6-15].

Патрыятызм праяўляецца ў учынках чалавека. Найважнейшай задачай у нашай краіне ў сучасных умовах з'яўляецца задача выхавання патрыятызму ў падрастаючага пакалення.У сувязі з гэтым у чарговы раз тэарэтыкі адукацыі і культуры задумаліся аб патанцыяле фальклору, этнічнай культуры беларусаў для патрыятычнага выхавання дзяцей и моладзі краіны. А таксама Міністэрства адукацыі зацвердзіла Канцэпцыю неперарыўнага выхавання дзяцей і моладзі . Адным з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай маладзежнай палітыкі з'яўляецца фарміраванне актыўнай грамадзянскай пазіцыі моладзі, патрыятызму.

Выхоўваць патрыёта – значыць фарміраваць чалавека, якому ўласцівы любоў да Радзімы, імкненне да яе працвітання і магутнасці, моцная грамадзянская пазіцыя.Збіранню, даследаванню і захаванню фальклорнай спадчыны спрыяла нястомная дзейнасць сусветна вядомых на сённяшні дзень навукоўцаў. Змест паняцця патрыятызму і праблем фармавання патрыятычнай свядомасці паходзіць з старжытных часоў. Патрыятызм як глыбока сацыяльнае па сваёй прыродзе з'ява ўяўляе сабою не толькі грань жыцця грамадства, але і крыніцу яго існавання і развіцця, выступае як атрыбут жыццяздольнасці, а часам і выжывальнасці соцыума. Падобнае асэнсаванне патрыятызму атрымала развіццё ў працах рускіх прадстаўнікоў канца XIX - пачатка XX ст.ст.: С.Н. Булгакава, І.А. Ілліна, Л.Ф. Лосева і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак пры ўсёй значнасці вынікаў праведзеных раней педагагічных даследаванняў і перадавога педагагічнага вопыту, праблема выкарыстання фальклору ў справе патрыятычнага выхавання моладзі працягвае патрабаваць далейшага вывучэння, асабліва з улікам апоры на рэгіянальны матэрыял.

Народная творчасць – не проста багацейшы культурны скарб, назапашаны многімі пакаленнямі, а своеасаблівая форма генетычнай памяці этнаса, важнейшы сродак выяўлення нацыянальнай свядомасці, непаўторнасці, самабытнасці народа [1, с.749]. Нягледзячы на тое, што вывучэнне і захаванне традыцыйнай культуры з'яўляецца моцным падмуркам дзяржаўнай ідэалогіі, адыгрывае важную ролю ў патрыятычным і культурным выхаванні, садзейнічае гуманізацыі нашага грамадства, адраджэнню яго маральных ідэалаў, развіццю грамадскай свядомасці і нацыянальнай самасвядомасці.

Вусная народная творчасць, родная мова, мелодыі роднай зямлі забяспечваюць духоўную сувязь паміж сучаснікамі, іх прашчурамі і нашчадкамі. Захаванне фальклору выступае гарантам вечнасці, раўнавагі, неабходных для нармальнага развіцця і жыццядзейнасці [2, с.32-36]. Таму выкарыстанне фальклору падчас правядзення выхаваўчых мерапрыемстваў – гэта адначасова і матэрыял для вывучэння, даследвання, і матэрыял для роздуму. І самае галоўнае – усе гэта спрыяе выхаванню цікавасці і павагі да роднай мовы, да культуры Беларусі, – асновы патрыятычнасці асабы.

Прывіць штучна любоў да роднай мовы, да Бацькаўшчыны, немагчыма, а вось зацікавіць, павесці за сабой – па сілах бацькам і педагогам.

**Спіс літаратуры:**

1. Беларускі фальклор : хрэстаматыя : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / склад. К.П. Кабашнікаў, А.С. Ліс, А.С. Фядосік, І.К. Цішчанка. – 3-е выд., пераапрац. – Мн. : Вышэйш. шк., 1985. – 749 с.
2. Гринчик, Н.М. Свод «Белорусское народное творчество»: фольклорные традиции в контексте национальной духовной культуры / Н.М. Гринчик // Вопросы культуры и искусства Белоруссии : респ. межвед. сб. науч. тр. – Мн. : Вышэйш. шк., 1989. – Вып. 3. – С. 32 – 36.
3. Микрюков, В. Патриотизм: к определению понятия / В. Микрюков // Воспитание школьников. – 2007. – № 5. – С. 2–8.
4. Рамановіч, Г.Г. Выхаванне духоўнасці і патрыятызму ў сучасных умовах / Г.Г. Рамановіч // Сацыяльна-педагагічная работа. – 2001. – № 6. – С. 6–15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ